Таким образом, в соответствии со ст. 21, 40 и 60 Конституции мы полагаем необходимым закрепить посредством принятия закона порядок реализации права граждан на обращение в Конституционный Суд, что предусмотрено ч. 7 ст. 116 Конституции. Право граждан обращаться в органы конституционного контроля является важным фактором в механизме обеспечения прав и свобод человека.

***В.А. Палуносік***
БДЭУ (Мінск)

# СУДОВАЯ ЎЛАДА І СУДАВОДСТВА Ў РАННІМ СЯРЭДНЯВЕЧЧЫ ПАВОДЛЕ РУСКАЙ ПРАЎДЫ І МІЖНАРОДНЫХ ДАГАВОРАЎ

Неабходна адзначыць, што асаблівую цікавасць для навукоўцаў маюць гістарычныя помнікі права XI—XIII ст. Менавіта тады звычаевае права ўпершыню атрымала больш-менш аднародную форму, дзякуючы яго пісьмоваму афармленню: пачынаючы з нарматыўных актаў XI—XIII ст. судаводства пачынае імкнуцца да ўніверсальнасці незалежна ад месца яго вядзення і мясцовых звычаяў. У Рускай Праўдзе і дагаворах 1229, 1263 і 1265 гг. мы бачым спробу замацаваць агульныя прынцыпы судаводства.

Старажытнабеларускае права яшчэ не ведала выразнага размежавання паміж крымінальным і грамадзянскім працэсам, але вядома, што некаторыя працэсуальныя дзеянні (напрыклад, ганенне следу, збор) маглі ўжывацца толькі па крымінальных справах. Ва ўсякім разе, і па крымінальных, і па грамадзянскіх справах ужываўся адкрыты і вусны абвінаваўчы працэс, пры якім бакі былі раўнапраўнымі і самі з'яўляліся ініцыятарамі ўсіх працэсуальных дзеянняў.

Руская Праўда ведае дзве спецыфічныя працэсуальныя формы дасудовай падрыхтоўкі справы — ганенне следу і збор. Ганенне следу — гэта пошук злачынцы па яго слядах. Калі след прыводзіў да хаты пэўнага чалавека, лічылася, што ён і ёсць правапарушальнік, калі ў сяло — адказнасць несла абшчына, калі след страціўся на вялікай дарозе —пошук спыняўся. Здаралася, што згубленая рэч не была знойдзена, тады пацярпелы звяртаўся да заклічу — аб'яве на гандлёвай плошчы пра страту рэчы. Той, у каго знаходзілася рэч, павінен быў паказаць асобу, у якой ён яе набыў. Пры гэтым патрабаваліся сведчанні двух сведак ці мытніка. Гэта і быў працэс збору.

Закон прадугледжваў вызначаную сістэму доказаў. Сярод іх важнае месца займалі паказанні сведак. Існавала дзве катэгорыі сведак — відакі і сведкі. Відакі — гэта відавочнікі факту. Сведкі — больш складаная катэгорыя. Гэта асобы, якія чулі пра тое, што здарылася, ад ка-


БДЭУ. Беларускі дзяржаўны эканамічны ўніверсітэт. Бібліятэка.
БГЭУ. Белорусский государственный экономический университет. Библиотека.°.
BSEU. Belarus State Economic University. Library.
http://www.bseu.by elib@bseu.by

го-небудзь. Часам яны проста як бы давалі характарыстыку таму ці іншаму боку, павінны былі паказаць, што адказчык ці ісцец — людзі, годныя даверу. Зрэшты, ужо Руская Праўда не заўсёды вытрымлівала выразнае адрозненне паміж відакамі і сведкамі.

Існавала і судовае спаборніцтва — «поле». Выйграваў справу той, хто перамог. Згодна з даговорам 1229 г., у бой нельга было ўмешвацца нікому. У больш сур'ёзных выпадках, чым выпрабаванне вадой, ці калі не хапала іншых доказаў ужывалася выпрабаванне жалезам. Нельга было праводзіць выпрабаванне жалезам без згоды асобы. Руская Праўда прысвячае гэтым доказам тры артыкулы, але не тлумачыць тэхнікі іх правядзення. Адмысловым выглядам доказаў была прысяга — «рота». Яна ўжывалася, калі не было іншых доказаў, але, зразумела, па невялікіх справах. У некаторых выпадках мелі доказнае значэнне вонкавыя прыкметы і рэчавыя доказы. Так, наяўнасці сінякоў было досыць для доказу збівання. Даследчыкі мяркуюць, што ў царкоўным судзе ўжываўся і інквізіцыйны працэс з усімі яго атрыбутамі, у тым ліку і катаваннем.

У Рускай Праўдзе бачны вызначаныя формы забеспячэння выканання судовага рашэння, напрыклад, спагнанне віры з забойцы. Азначаная службовая асоба (вірнік) прыязджала ў хату асуджанага са світай і чакала выплаты віры, атрымліваючы кожны дзень багатае натуральнае ўтрыманне. Таму злачынцу больш выгадна было як мага хутчэй выканаць свае абавязкі і пазбавіцца ад непрыемных наведвальнікаў.

Такім чынам, можна зрабіць выснову аб тым, што развіццё судавадства на Беларусі ў XI—XIII ст. было прыкладна на адным узроўні з судаводствам у суседніх землях. Гэта абгрунтоўваецца тым, што адной з галоўных крыніц судаводства на Беларусі з'яўлялася Руская Праўда, нормы якой дзейнічалі на даволі вялізнай тэрыторыі. І ў нашай судовай практыцы XI—XIII ст. мы бачым саслоўную няроўнасць, недасканаласць судовага працэсу, цалкам не сфарміраваную сістэму доказаў, недахопы з-за казуальнага выкладання прававых норм.

***Я.В. Попова***
БИП (Минск)

# СОВРЕМЕННЫЕ ТЕНДЕНЦИИ СУДЕБНОЙ ЗАЩИТЫ ОБЪЕКТОВ ИНТЕЛЛЕКТУАЛЬНОЙ СОБСТВЕННОСТИ

В Республике Беларусь гарантией реализации конституционного права на судебную защиту и гарантией защиты на должном уровне нарушенных прав на объекты интеллектуальной собственности является создание и функционирование Судебной коллегии по делам интеллектуальной собственности Верховного Суда Республики Беларусь, имею-



БДЭУ. Беларускі дзяржаўны эканамічны універсітэт. Бібліятэка.
БГЭУ. Белорусский государственный экономический университет. Библиотека.°.
BSEU. Belarus State Economic University. Library.
http://www.bseu.by elib@bseu.by